ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 26 (755) ● Пятніца, 3 кастрычніка 1969 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXII

## НЕЗВЫЧАЙНАЯ ЎРАЧЫСТАСЦЬ

Заўтра ў нашым універсітэце вялікая ўрачыстасць — злёт студэнцкіх будаўнічых атрадаў 1969 года. Больш як 900 дэлегатаў трохтысячнай арміі байцоў-будаўнікоў збяруцца для таго, каб падвесці вынікі ленінскага ўдарнага працоўнага семестра, успомніць пра тых, хто сем год назад паклаў пачатак студэнцкай будоўлі.

Падрыхтавана не зусім звычайная праграма злёту. У яе уключан рэпартаж (год 1963—год 1969). Прысутныя пачуюць імёны першых цаліннікаў, цікавыя факты з гісторыі працоўных семестраў кожнага факультэта і г. д. Пераможцы сацыялістычнага спаборніцтва, прысвечанага стагоддзю з дня нараджэння У. І. Леніна, будуць адзначаны памятнымі сцягамі, граматамі ЦК ЛКСМБ, камітэта камсамола, рэктарата БДУ, Кастрычніцкага райкома, Мінскага гаркома і абкома камсамола, каштоўнымі падарункамі. Імёны лепшых студэнтаў-будаўнікоў будуць занесены ў Летапіс камсамольскай славы БДУ.

На злёт запрошана дэлегацыя ЦК ВЛКСМ, якая ўручыць памятны сцяг нашым двум атрадам, якія працавалі ў горадзе Тальяцці і занялі першае месца ў спаборніцтве студэнцкіх будаўнічых калектываў. На форуме будуць прысутнічаць дэлегацыя з Тальяцці, дэлегацыя Уральскага АК ВЛКСМ на чале з першым сакратаром А. Сабіравым.

Да сустрэчы, дарагі сябра, цябе чакае многа цікавага!

## ПАПРАЦАВАЛІ ВЫДАТНА

Стала ўжо традыцыяй восенню ў пачатку навучальнага года выязджаць у калгасы. Капаць бульбу—справа нялёгкая. Але студэнты не баяцца цяжкасцей. І нават тыя, хто ўсё лета працаваў у саставе будаўнічых атрадаў у Беларусі, Казахстане, на Поўначы, у піянерскіх лагерах, на будоўлях Мінска, паехалі на дапамогу хлебаробам.

У вёсцы Пухлякі (саўгас Рагоўскі, Мінскі раён) працавалі матэматыкі—22 студэнты другога і трэцяга курсаў. Звычайныя хлопцы і дзяўчаты. Але як працавалі! Кожны дзень капалі па 15—20 тон бульбы. А гэта не так ужо і проста, асабліва для тых, хто адпачываў усяго два тыдні. І надвор'е, як назло, халоднае. Вецер. Ноччу мароз. Але ні разу не было чутна ні аднаго незадаволенага голасу. Адкуль узяліся ў рабят энергія і бадзёрасць — цяжка сказаць. Цяжка назваць таксама і перадавікоў: усе працавалі выключна. Дзяўчаты дапамагалі хлопцам, хлопцы — дзяўчатам. Ніхто не пакідаў поле раней, чым апошняя бульбіна не была сабрана з баразны, нават калі для гэтага трэба было затрымлівацца на полі.

Усе працавалі вельмі дружна. А якасць уборкі здзіўляла нават брыгадзіра. «Яны ж капаюць лепш, чым калгаснікі», — не раз гаварыў ён.

Усяго за дзесяць дзён студэнты сабралі больш 160 тон бульбы з плошчы 11,5 гектара. Відаць, летні працоўны семестр быў для іх добрай школай.

**О. КАСТРЫЦА,**
**студэнт V курса матфака.**

## ПЕРШАЯ АЎДЫТОРЫЯ— КАЛГАСНАЕ ПОЛЕ

БЯСКОНЦЫЯ беларускія прасёлкі вызалаціла восень сваімі дарамі, расквеціла гірляндамі карычневага бульбяніку на платах, звісла над вуліцамі і завулкамі янтарнымі завушніцамі сліў, разбеглася па лугах і сенажацях раўнюткімі радамі разасланага льну. Неяк цішэй стала ў наваколлі.

Восень уладарна наступае з кожным днём, таму і руплівыя гаспадары калгасных палёў спяшаюцца з апошнімі работамі. Бульба — завяршальны акорд у складанай працы хлебароба. Але разам з гэтым у калгасах сеюць азімыя, сіласуюць лубін і кукурузу, а на таках ляжаць горы неўладкаванага зерня. Клопатаў столькі, што часам немагчыма калгаснікам справіцца сваімі сіламі. Таму і едуць студэнты па закліку вёсак на дапамогу — на ўборку.

80 студэнтаў першага курса факультэта журналістыкі працавалі ў калгасе «Перадавік» Чэрвеньскага раёна. За дваццаць дзён з 55 гектараў убрана больш чым пяцьсот тон бульбы, або палавіна ўраджаю ў калгасе, зароблена дзве з палавінай тысячы рублёў — такі вынік добрасумленнай працы будучых журналістаў.

Зразумела, не ўсё было гладка з першага дня. Працэс фарміравання капальшчыкаў для кожнага праходзіў па-рознаму. Хто раней меў справу з бульбай не толькі за абедзенным сталом, той адразу ж прызвычаіўся да мясцовых умоў. А былі ж і такія, у каго і рукі не лезлі ў зямлю і спіна раптоўна перастала гнуцца, нават вядро або кошык ператвараліся ў нязручную ношу. Камісарам было работы. Аляксандр Сачанка добразычліва пасмейваўся з тых, хто цягнуўся ў хвасце, а Люда Бялкоўская амаль крыўдзілася, калі што не ладзілася.

Тым не менш праз некалькі дзён студэнты дасягнулі абавязковай нормы, а ў вёсках Вялікаполле, дзе працавала першая група, і Плецявішчы — там змагалася частка трэцяй групы — пайшлі значна далей. Заўсёды перамагалі энергія маладосці, пачуццё задавальнення ад калектыўнай працы, сяброўская ўзаемадапамога і, нарэшце, усведамленне важнасці справы, якую выконвалі студэнты ў калгасе. Апошняе самае галоўнае, аб чым мы часам забываем, калі спяшаемся адправіць студэнтаў на дапамогу калгаснікам.

Прыемна было слухаць старога калгасніка, які захапляўся працай студэнтаў: «Бач, як рухаюцца — як журавы роўным шнурочкам!». «Добра працуюць!» — у адзін голас гаварылі брыгадзіры, а тэмпераментны і вечна заклапочаны аграном не шкадаваў слоў падзякі і ў кожным выпадку спяшаўся выказаць сваё захапленне.

Сапраўды, было чым захапляцца. Капаць бульбу — гэта не выграбаць яе з печы, як трапна гавораць калгаснікі. Тым не менш хлопцы і дзяўчаты не адставалі ад спрактыкаваных калгаснікаў, а Марыя Лубнеўская, Міхаіл Скамейка, Уладзімір Наркевіч, Валянціна Фясько і многія іншыя працавалі нараўне з імі.

З асаблівым энтузіязмам працавалі студэнты на арганізаваным нядзельніку, У гэты дзень было ўбрана 30 тон бульбы. Заробленыя грошы пойдуць у фонд пабудовы помніка студэнтам і выкладчыкам універсітэта, якія загінулі ў час Вялікай Айчыннай вайны.

Ды і не толькі на полі стараліся рабяты! Не паспеюць прыйсці яны дадому, як і тут бачна: хто нясе ваду, хто вязе дровы, салому. Дзяўчаты ўсклалі на сябе абавязак сачыць за парадкам у хатах.

Былі і песні, і агні восеньскімі начамі, і танцы ў клубе. Выпускалася газета «На ніве калгаснай». Цяпер кожны першакурснік знае свайго таварыша, яго недахопы і вартасці. «Вам цяпер лягчэй будзе вучыцца, — правільна сказаў сакратар камітэта камсамола Васіль Гурын, — бо нідзе так яскрава не праяўляюцца якасці чалавека, як у працы».

Бульбяная кампанія для першага курса закончылася. Яна выявіла вялікія магчымасці юнакоў і дзяўчат, іх энергію, якая дае права сказаць, што і ў вучобе яны могуць дабіцца значных поспехаў.

«Вялікае дзякуй, — гаварыў на развітанне старшыня калгаса. — Сваёй бескарыснай працай вы дапамаглі вывесці наш калгас на другое месца ў раёне па ўборцы бульбы. Наша задача цяпер — не збавіць вашага тэмпу».

Для першага курса гэта быў пачатак сумеснай працы, працы за паспяховае авалоданне ведамі. Вельмі далёкае параўнанне — калгаснае поле і аўдыторыя, але ў аснове абодвух паняццяў ляжыць настойлівая праца. Шчаслівай дарогі, журналісты, на гэтай ніве!

**А. СЛУКА,**
сакратар партыйнай арганізацыі факультэта.

АБ СПРАВАХ ПРАЦОЎНЫХ — НА 1—2-й СТАР.

## З ВЯЛІКАЙ ЗАЦІКАЎЛЕНАСЦЮ



Апошняя дэкада верасня была багата цікавымі сустрэчамі. У гэтыя дні універсітэт наведала вялікая група замежных карэспандэнтаў, акрэдытаваных пры аддзеле друку МЗС СССР, якія ўдзельнічалі ў паездцы па Беларускай ССР. Госці нашай рэспублікі пабывалі на прамысловых прадпрыемствах, у калгасах, наведалі рэдакцыі газет, агледзелі гістарычныя і культурныя помнікі сталіцы.

З вялікай цікавасцю прадстаўнікі друку сацыялістычных краін, карэспандэнты органаў друку кампартый буржуазных краін знаёміліся з універсітэтам. У час гутаркі ў рэктараце прысутнічалі Янаш Немеш (газета «Непсабадшаг» ВНР), Ёжэф Хавель (Венгерскае тэлеграфнае агенцтва), Ханс Ронебургер (АДН, ГДР). Эберхард Зайбольд (Дзяржкамітэт, ГДР), Намсарай Цэрэндашыйн (газета «Унэн» і агенцтва МОНАЦАМЭ, МНР), Ежы Крашэўскі («Трыбуна люду», ПНР). Дабраслаў Папшэчка (Рабочае агенцтва, ПНР), Сільвіу Падынэ (газета «Скынтэйя», СРР), Лаўрэнцыу Дуцэ (Румынскае агенцтва друку Аджэрпрэс), Антанін Міхалек (газета «Рудэ права», ЧССР), Здэнек Груша (Чэхаславацкае тэлеграфнае агенцтва), Мілан Бекіч (газета «Віеснік», СФРЮ), Марян Седмак (газета «Дела», СФРЮ), Альфрэдо Абарка (газета «Унідад», Перу), Руф і Майк Давыдавы (газета «Дэйлі Уорлд», ЗША), а таксама выкладчыкі і супрацоўнікі універсітэта — прафесар У. М. Сікорскі, дацэнт журфака М. Я. Цікоцкі, старшыня мясцовага камітэта дацэнт А. А. Галаўко і іншыя. Прарэктар, член-карэспандэнт АПН СССР С. А. Умрэйка паведаміў лічбы росту універсітэта, ахарактарызаваў кожны з дзевяці факультэтаў, расказаў аб кадрах і саставе студэнтаў, аб аспірантуры і матэрыяльнай базе старэйшай вну рэспублікі.

Цэлы шэраг пытанняў, зададзеных замежнымі карэспандэнтамі, быў звязаны з падрыхтоўкай журналісцкіх кадраў. Гасцей цікавілі формы адбору здольных абітурыентаў, арганізацыя вучобы і практыкі. Падрабязна аб спецыфіцы журфака расказаў загадчык кафедры тэорыі і практыкі савецкага друку М. Я. Цікоцкі.

Дацэнт А. А. Галаўко адказаў на пытанні аб ролі прафсаюза і сферы дзейнасці студэнцкай прафсаюзнай арганізацыі.

Пасля двухгадзіннай гутаркі госці наведалі бібліятэку і чытальныя залы, агледзелі музеі гістарычнага факультэта і вылічальны цэнтр.

## У ГОСЦІ І НА ПРАКТЫКУ

### ФІЗІКІ АБМЕНЬВАЮЦЦА ВОПЫТАМ

Цяпер ва універсітэце знаходзіцца дацэнт кафедры эксперыментальнай фізікі Сафійскага універсітэта Канстанцін Стаменаў. Ён знаёміцца з пастаноўкай вучэбнай і метадычнай работы на факультэце, цікавіцца вучэбнымі лабараторыямі, работай аптычных кафедр і аспірантуры.

Госць з Сафіі выступіць перад студэнтамі і супрацоўнікамі з лекцыяй.

# РАПАРТУЕ ЛЕНІНСКІ ЎДАРНЫ

## КАМІТЭТУ КАМСАМОЛА,

## ШТАБУ ПРАЦОЎНЫХ СПРАЎ

Атрад на месца дыслакацыі прыбыў 28 чэрвеня ў 21.00. Адразу ж быў размешчаны ў інтэрнаце БМУ ў в. Доўгае. Працуем на другім аб'екце. Дагавор не перазаключалі. Вялікія цяжкасці з тэхнікай: не даюць трактараў для вывазу матэрыялу з лесу. Працуем на ўмацаванні адкосаў каналаў.

2.7.69. **Штаб СБА «Буравеснік-69» філалагічнага факультэта.**

СБА «Уран» у колькасці 18 чалавек прыбыў на месца работы ў саўгас «Ляды» Чэрвеньскага раёна. Забяспечаны ўсім неабходным для працы і адпачынку. Прыступаем да работы. Настрой бадзёры.

2.7.69. **Штаб СБА «Уран».**

Даехалі добра. Размясціліся ў 12 км ад г. Рэчыцы ў вагончыках. У радыусе аднаго кіламетра — ні душы. Акрамя ТХУ, будуем гараж на 50 аўтамабіляў. З мясцовым насельніцтвам наладзілі кантакт. Ніякіх здарэнняў не адбылося.

Наш адрас: (на жаль, яго пакуль што няма). Можна: г. Рэчыца, Цэнтр, пошта. Да запатрабавання.

8.7.69. **Штаб СБА «АС-С-69».**

Прывітанне з Чагана!

Дзень добры, браты-беларусы!

Вы прасілі нас паведамляць, як мы даедзем, як уладкуемся. Рапартуем:

Пачынаем абжывацца. Пасёлак, дзе мы жывём, вялікі. Моладзі многа. Думаем пасябраваць. Кантакты ўжо ёсць. Вытворчую праграму выконваем. Зрабілі ўжо фундамент пад зернясховішча (60×20×1,1) і па два двухкватэрныя домікі. Зроблена і яшчэ многа больш дробных спраў. Думаю, што вашы спадзяванні апраўдаем. Дысцыпліна ў атрадзе належная.

2.7.69. **Камандзір СБА «Нёман» А. БУТЭВІЧ.**

Даехалі добра. Сустрэчай задаволены. Работа добрая. Наш адрас: Куйбышаўская вобласць, г. Тальяці, студэнцкі гарадок. БУ-65.

8.7.69.

Прывітанне з Любані!

Атрад «Альтаір» фізічнага факультэта размясціўся на ўскраіне Любані, у раёне пеньказавода. Да работы прыступілі 2 ліпеня. Жывём у інтэрнаце БМУ і вагончыках. Арганізаван студэнцкі катлапункт (кухня, сталовая). Прадуктамі атрад забяспечан.

Прастояў у рабоце няма. Рыхтуем да здачы першыя паўтара кіламетра каналу. Арганізавалі кансультацыйны пункт. Заняткі праводзяцца па аўторках і пятніцах, пасля работы, на паляне. Сабрана бібліятэка ў падарунак школе сяла Сарачы. Падтрымліваем непарыўную сувязь з раённым камітэтам камсамола.

**Камандзір атрада А. КУРЛОВІЧ.**
2.7.69. **Камісар атрада Д. ЦАРУК.**

Працоўныя заданні, нягледзячы на неспрыяльныя кліматычныя ўмовы, выконваюцца паспяхова. Наладжаны цесныя сувязі з мясцовым насельніцтвам. Прапаноўвалі свае паслугі саўгасу на ўборцы сена. Атрад поўны сіл і энергіі для далейшай работы.

**Камандзір атрада А. ЗАЙЦАЎ.**
13.7.69 **Камісар атрада В. КПЫТА.**

Добры дзень, дарагія сябры!

Атрад «Электра» прыступіў да работы па электрыфікацыі калгаса «Нёман» Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці. Мы вядзём будаўніцтва і мантаж ЭП-0,4 кв і ЛЭП-10 кв, мантаж сілавых установак і канструкцый уводаў у вёсцы Беражное. Усе байцы атрада аформлены на работу па III разраду. Атрад разбіт на тры брыгады.

Да 12 ліпеня было падрыхтавана да пад'ёму каля 190 апор ВЛ-0,4. З 15-га мы прыступаем да мантажу. Увесь час атрад быў забяспечаны работай, і байцы атрада ўцягнуліся ў працоўны рытм. Будаўнічае ўпраўленне добра забяспечвае тэхнікай і матэрыяламі. З калгасам устанавіліся дзелавыя адносіны. Трымаем цесныя сувязі з сельскай моладдзю. Палітаддзел атрада праводзіць палітінфармацыі і прыступіў да арганізацыі лекцыйнай прапаганды.

**Камандзір атрада Ю. БАЦІШЧА.**

План тыдня выканан атрадам поўнасцю. Парушэнняў тэхнікі бяспекі не было.

Наш атрад уваходзіць у састаў зводнага атрада, які складаецца з СБА са Свярдлоўска, Масквы, Новасібірска і Алма-Аты.

На мінулым тыдні наш атрад правёў вечар сустрэчы з іншымі атрадамі. Удзельнікі самадзейнасці далі канцэрт для рабочых Эстонскай ГРЭС. У суботу атрад дапамагаў на сенакосе прыгараднаму саўгасу.

4.7.69. **Камандзір СБА «Эстонія-69» А. РАМАНАЎ.**

Атрад «Модуль» паспяхова спраўляецца з вытворчай праграмай, нягледзячы на некаторыя цяжкасці, з якімі нам давялося сутыкацца.

19 ліпеня быў праведзены суботнік у фонд будаўніцтва помніка загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны студэнтам і выкладчыкам універсітэта. Заробленыя грошы высылаем у камітэт камсамола. У атрадзе вядзецца палітыка-выхаваўчая работа. Выпускаецца сценгазета і фотагазета. Для мясцовага насельніцтва падрыхтавалі канцэрт мастацкай самадзейнасці. У бліжэйшы час будзе праведзены нядзельнік па рамонту абсталявання школы.

Настрой бадзёры.

28.7.69. **Камандзір атрада В. ЛАХАДАНАЎ.**

...Жаданне добра папрацаваць, працоўны энтузіязм далі магчымасць у цэлым па атраду даваць у сярэднім 160 працэнтаў нормы. Байцы атрада могуць павялічыць гэту лічбу пры лепшым забеспячэнні матэрыяламі.

10.8.69. **Камісар атрада А. САПУНОЎ.**

## *РЭКТАРУ*

**БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.**

**Паважаны Антон Нікіфаравіч!**

**Кіраўніцтва будаўнічага ўпраўлення № 65 «Промбуда-2» выказвае Вам глыбокую ўдзячнасць за ўмелае выхаванне Вашых студэнтаў. З пачуццём глыбокага задавальнення паведамляем Вам, што студэнцкі атрад імя 25-годдзя вызвалення Беларусі ў саставе 140 студэнтаў (камандзір атрада Ротман Д. Г., камісар Аўраменка А. І., парторг Макаранка М. І., сакратар камсамольскага бюро Ануфрыеў А., камандзіры лінейных атрадаў Гайдзельцаў У. С., Талалава Г. М., Прымакоў І. У.) з гонарам выканалі пастаўленыя перад імі задачы на будаўніцтве новага аўтамабільнага гіганта — Волжскага аўтазавода.**

**З глыбокай павагай**

Начальнік будаўнічага ўпраўлення Е. ЛЯВІЦКІ.

Сакратар партбюро І. МАРОЗАЎ.

Старшыня будаўнічага камітэта Е. ЧЭРШКУС.

Сакратар камітэта камсамола Н. МАКСІМОВІЧ.

## *ДЭКАНУ*

**ГІСТАРЫЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА БДУ ТАВ. САВАЧКІНУ П. З.**

**САКРАТАРУ КАМСАМОЛЬСКАЙ АРГАНІЗАЦЫІ.**

**Паведамляем, што студэнткі чацвёртага курса Вашага факультэта Лена Аскерка, Нэля Тарыкова, Тамара Ястрэмская працавалі ў лабараторыі агратэхнікі Крымскай занальна-вопытнай станцыі ВІТІМа з 4 па 31 ліпеня г. г. і паказалі сябе з самага лепшага боку. Кожная з іх выпрацавала па 42 нормы пры выдатнай якасці работы.**

**Сваёй сціпласцю, бездакорнымі паводзінамі, высокай працоўнай дысцыплінай і працавітасцю яны здабылі любоў і павагу рабочых і навуковых супрацоўнікаў лабараторыі, якія выказалі ім глыбокую ўдзячнасць за іх дапамогу.**

**Жадаем Вам поспехаў у выхаванні такой моладзі.**

Намеснік дырэктара па навуцы, сакратар партарганізацыі М. АМІРАЎ.

Старшыня рэвізійнай камісіі В. РАМАШЫНА.

Сакратар камітэта камсамола Л. КАНДРАЦЮК.

## *СЯБРОЎСТВА КАВАЛАСЯ Ў ПРАЦЫ*

Сёлета ўжо ў трэці раз група студэнтаў нашага універсітэта выязджала ў Германскую Дэмакратычную Рэспубліку, каб правесці свой працоўны семестр у саставе інтэрнацыянальнага будаўнічага атрада. У сваю чаргу нямецкія студэнты з Іенскага універсітэта імя Ф. Шылера прыязджаюць у нашу рэспубліку і разам са студэнтамі БДУ працуюць на беларускай зямлі.

У паўсядзённай сумеснай працы студэнты дзвюх сацыялістычных краін яшчэ бліжэй знаёмяцца з жыццём і дзейнасцю маладзёжных арганізацый, з гісторыяй рэвалюцыйнага руху народаў, з працоўнымі поспехамі, нацыянальнай культурай і г. д.

Гэты год для нашых нямецкіх сяброў з'яўляецца асабліва знамянальным: 7 кастрычніка споўняецца 20 год з дня ўтварэння Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі. У час знаходжання ў ГДР беларускія студэнты бачылі, як рыхтуецца нямецкі народ урачыста адзначыць юбілей сваёй рэспублікі.

Нашы рабяты таксама пакінулі добрую памяць у сэрцах нямецкай моладзі. Студэнцкай брыгадай нямецка-савецкай дружбы «Іена-69» было асвоена за ліпень месяц гэтага года 100 тысяч нямецкіх марак капіталаўкладанняў. За поспехі ў працы брыгада атрымала пераходны сцяг ССНМ акругі Гера з надпісам: «Лепшая студэнцкая брыгада. 1969 г.»

Назаўсёды запомняцца нашым студэнтам сяброўскія сустрэчы, гарачыя дыскусіі па маладзёжных праблемах.

Сардэчнай была сустрэча з маладымі рабочымі металургічнага камбіната «Максхютэ». Знаёміў нас з прадпрыемствам малады нямецкі інжынер, выпускнік Ленінградскага політэхнічнага інстытута.

Паездка па гарадах ГДР, знаёмства з іх каштоўнымі вартасцямі пашырыла наша ўяўленне аб нямецкім народзе, яго нацыянальнай культуры.

З хваляваннем і захапленнем аглядалі мы ў горадзе кірмашоў Лейпцыгу помнік бітвы народаў. У гэтым жа горадзе мы наведалі музей імя Дзімітрава.

У Дрэздэнскай галерэі мы з вялікай цікавасцю пазнаёміліся з арыгіналамі карцін сусветна вядомых мастакоў Рубенса, Тыцыана, Веласкеса, Ван Дэйка і іншых. Мы ніколі не забудзем тых хвалюючых мінут, якія перажылі ў Трэптаў-парку — помніку савецкаму воіну-вызваліцелю ад фашысцкага іга.

**Л. ДАВЫДЗЕНКА,**
**кіраўнік інтэратрада.**



**НА ЗДЫМКУ:** беларускія студэнты ў гасцях у маладых рабочых металургічнага камбіната «Максхютэ».

**НА ЮРФАКУ ВЫЙШАЎ першы нумар факультэцкай сценгазеты. Паколькі для большасці студэнтаў вучэбныя заняткі толькі распачаліся, то, натуральна, амаль увесь ён прысвечан працоўным справам юрыстаў. Сваімі ўражаннямі аб трэцім семестры дзеляцца А. Злотнікава, Л. Матусевіч, Т. Цемнянкова. Не абышоўся выпуск і без матэрыялаў, якія расказваюць аб «бульбянай эпапеі». Апошняй адведзена большая частка газеты. Карэспандэнты «Савецкага юрыста» А. Бяржанін, М. Басаў, С. Бойка пабывалі на калгасных палях, дзе працавалі студэнты, і на шматлікіх фотаздымках паказалі іх сельскі будзень.**

**Ёсць у нумары і літаратурны куток. Тут змясцілі свае вершы Л. Матусевіч, М. Чудакоў, Т. Цемнянкова, разважанні аб фільме «Жывы труп» — А. Бяржанін.**

**Ну, і, безумоўна, вялікую цікавасць уяўляе сатырычны аддзел, дзе ў трапных карыкатурах паказаны дэбашыры, п'яніцы, гультаі.**

**Сценгазета «Савецкі юрыст» багата ілюстравана. Сёння мы змяшчаем адзін з матэрыялаў гэтага нумара.**

## ГРАБЁНКА

*У вёску Грабёнка, дзе працуюць студэнты 2-га курса, мы дабраліся, калі пачынала цямнець. Ззаду заставаліся пыльныя дарогі Чэрвеньшчыны. Хутка знайшлі арыенцір на мясцовасці, дазналіся, дзе жывуць студэнты.*

*Першым знайшлі Юрыя Іванавіча Рэутава. Яму былі і першыя нашы пытанні:*

*— Як працуюць рабяты? Дзе жывуць? Як праводзяць свой адпачынак?*

*— Курс раздзелен на дзве групы. Адна з іх працуе на полі, другая выконвае «спецзаказ» для свінафермы. З работай рабяты спраўляюцца добра. Сёння група ў 30 чалавек сабрала 16 тон бульбы.*

*Жывуць студэнты па некалькі чалавек у дамах калгаснікаў. Харчуюцца — у сталовай. У вёсцы ёсць клуб.*

*— А як «ЧП», былі?*

*— Не. Гэтага ў нас не бывае...*

*А вось і машына. Прыехалі з поля стомленыя, запыленыя і галодныя студэнты. Нас пранізваюць насмешлівыя погляды:*

*— А-а, дапамога прыбыла!..*

*— Сачкі...*

*— Нахлебнікі... — І ў той жа час:*

*— Газеты прывезлі?..*

*Другое наша інтэрв'ю бяром у сталовай. Расказвае камандзір групы М. Капітан:*

*— Працуюць рабяты выдатна. Затрымка толькі за машынамі. Прыклад паказваюць Казловіч, Доўнар, Петуховіч, Ягорава, Жалтова, Вауліна... Цяжка нават усіх пералічыць!*

*На кухні, разгаварыўшыся з нашымі студэнткамі, памочніцамі шэф-повара Беленькай і Сідаравай, мы дазнаёмся, што ў сталовай юрысты спраўляюцца з бульбай не горш, чым у полі. Сапраўды, рабят кармілі нядрэнна. Адзінай іх скаргай было тое, што часам не хапае гародніны. А жывуць жа ў вёсцы! Гэта, вядома, папрок у адрас калгаснага кіраўніцтва.*

*Вячэраць прыходзіць другая група, якая працавала на нарыхтоўцы бульбы для свінафермы. На работу ім даводзіцца хадзіць пяшком. І не дзіўна, што сталовую наведваюць яны не менш стомленыя, чым студэнты з першай групы. Работы ў іх таксама хапае.*

*Раніца наступнага дня абуджалася голасам М. Капітана, які выстрайваў свой баявы атрад: рабяты адпраўляліся на работу... Там, на полі, калі ўсе ўвайшлі ў працоўны рытм, мы зрабілі некалькі фотаздымкаў. Пасля, не марудзячы, адправіліся на свінаферму. І тут ўжо кіпела работа...*

*М. БАСАЎ,*
*А. БЯРЖАНІН,*
*С. БОЙКА.*



# ПА ДАРАГІХ МЯСЦІНАХ

*Рыхтуючыся да ленінскага юбілею, моладзь нашай рэспублікі праяўляе вялікую цікавасць да мясцін, звязаных з жыццём і дзейнасцю Уладзіміра Ільіча. У час летніх канікул савецкія і замежныя студэнты, якія вучацца ў БДУ і іншых вну сталіцы, разам з групай маладых рабочых у аўтапоездзе «Дружба» зрабілі падарожжа ў горад Ленінград. Аб гэтай паездцы мы папрасілі расказаць намесніка начальніка поезда «Дружба», супрацоўніка падрыхтоўчага факультэта У. Г. Галайшу. Маладзёжную дэлегацыю суправаджаў фотажурналіст Д. Р. Прэс. Яго цікавыя здымкі мы прапануем сёння ўвазе нашых чытачоў.*

Сёлета Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР, Беларускі рэспубліканскі Савет прафсаюзаў і ЦК ЛКСМБ арганізавалі ў гонар 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна турысцкі поезд «Дружба» ў Ленінград.

Больш чым у 10-дзённай паездцы прынялі ўдзел савецкія і замежныя студэнты БДУ імя У. І. Леніна, Беларускага політэхнічнага інстытута, тэхналагічнага і медыцынскага інстытутаў, педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага, інстытута народнай гаспадаркі імя В. У. Куйбышава і іншых навучальных устаноў рэспублікі. Разам з імі ў Ленінград выязджалі маладыя рабочыя мінскага ордэна Леніна трактарнага завода, камвольнага камбіната, гадзіннікавага завода і іншых прадпрыемстваў беларускай сталіцы, калектывы якіх падтрымліваюць цесныя сувязі з земляцтвамі замежных студэнтаў, што вучацца ў Мінску.

Сярод 162 удзельнікаў турысцкага поезда былі юнакі і дзяўчаты з Венгерскай Народнай Рэспублікі, Дэмакратычнай Рэспублікі В'етнам і Паўднёвага В'етнама, з Непала, Танзаніі.

Удзельнікі паездкі пабывалі ў многіх гістарычных месцах, якія звязаны з жыццём і дзейнасцю У. І. Леніна ў Ленінградзе. Яны наведалі ленінскія кватэры, філіял Цэнтральнага музея У. І. Леніна, Фінляндскі вакзал, музей Рэвалюцыі і іншыя выдатныя мясціны.

Вось дом № 7 у былым Казачым завулку. Тут Ленін жыў амаль паўтара года. Сюды да яго прыязджалі Г. М. Кржыжаноўскі і іншыя рускія рэвалюцыянеры. Тут Ільіч у 1894 — 1895 гг. працаваў над сваімі творамі «Што такое «сябры народа» і як яны ваююць супраць сацыял-дэмакратаў» і «Эканамічны змест народніцтва і крытыка яго ў кнізе пана Струве». Зараз у гэтым доме кватэра-музей У. І. Леніна. Такіх памятных мясцін у горадзе на Няве больш 230.

Асаблівую ўвагу турыстаў прыкавалі легендарны крэйсер «Аўрора» і Смольны. У Смольным ёсць цудоўная зала, дзе на II Усерасійскім з'ездзе Саветаў была абвешчана Ільічом Савецкая ўлада і яе першыя дэкрэты. Тут жа ёсць музей-кватэра Ільіча, дзе некаторы час ён жыў і працаваў разам з Н. К. Крупскай.

Незабыўнае ўражанне зрабілі на нашых турыстаў месцы апошняга падполля Ільіча ля возера Разліў. Так называецца і чыгуначная станцыя, якая знаходзіцца непадалёку. Затаіўшы дыханне, слухалі расказ экскурсавода і студэнтка Інстытута народнай гаспадаркі Людміла Дзядкова, і студэнты універсітэта афрыканец Чарльз Сонпал (з Танзаніі), в'етнамец Нгуен Тхак Бак і в'етнамка Нгуен Тхі Тхай, студэнты БПІ венгр Немет Мартон, непалец Упадхайя Мегх Радж, студэнтка БПІ Людміла Чаркасава і работніца Мінскага камвольнага камбіната Алена Пракоф'ева...

Хаваючыся ад сышчыкаў Часовага ўрада, У. І. Ленін 23 ліпеня 1917 года спыніўся ў доме Н. А. Емельянава непадалёку ад чыгуначнай станцыі Разліў. Жонка Емяльянава, маці сямі дзяцей, з'яўлялася членам бальшавіцкай партыі.

Адсюль Уладзімір Ільіч пераправіўся па пратоцы на возера Разліў і пад выглядам касца хаваўся ў будане на беразе да 21 жніўня 1917 года. Тут ён працаваў над сваім выдатным творам «Дзяржава і рэвалюцыя». Да гэтага часу ў створаным тут музеі беражліва захоўваюцца надзвычай простыя, але дарагія кожнаму рэчы Ільіча — кацялок, граблі, каса, лодка і іншыя.

Цікавіліся турысты і гісторыяй горада-героя на Няве, яго мінулым, сённяшнім і будучым, пабывалі ля манумента-помніка Пятру I, у Пецергофе з яго цудоўным паркам і фантанамі, у г. Пушкіне і Паўлаўску, у Ісакіеўскім саборы, Петрапаўлаўскай крэпасці, у Эрмітажы, наведалі Рускі музей і планетарый. А цеплаход «Метэор» катаў дружбаўцаў па Няве і Фінскаму заліву.

Спадабаўся турыстам і балет «Лебядзінае возера», які яны глядзелі ў пастаноўцы артыстаў Акадэмічнага тэатра оперы і балета імя С. М. Кірава.

Удзельнікі поезда «Дружба» наведалі Марсава поле і Пескароўскія мемарыяльныя могілкі.

— Музей пад адкрытым небам, — так назваў горад-герой на Няве в'етнамец Чан Ван Кам.

А венгр Міхай Мядзведскі сказаў:

— Марыў даўно пабываць у Ленінградзе. Рад, што мара збылася.

На ўсё жыццё запомняцца кожнаму і Неўскі праспект, і развядзенне мастоў над Нявой, і белыя ночы Ленінграда, і сама Нява, і Фінскі заліў, і Эрмітаж, і казачны метрапалітэн імя У. І. Леніна...

Горад-прыгажун, горад-герой — гэта вялікі музей гісторыі нашай краіны, савецкага народа.

**Ул. ГАЛАЙША,**
**намеснік начальніка поезда «Дружба».**









*⊙ Смольны... Тут нават сцены захоўваюць памяць аб Ільічу (здымак злева).*

*⊙ 3 (16) красавіка 1917 года каля Фінляндскага вакзала з гэтага браневіка прагучаў вялікі прызыў У. І. Леніна: «Няхай жыве сацыялістычная рэвалюцыя!».*

*⊙ Сусветна вядомы Разліў.*

*⊙ Прастата і сціпласць — адметныя рысы кватэр, дзе даводзілася жыць У. І. Леніну.*

## ДА 100-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ У. І. ЛЕНІНА

**Будуць занава рэстаўрыраваны Актавая зала, Ленінская аудыторыя, калідоры і лесвіца, па якой разам са сваімі равеснікамі на вядомую рэвалюцыйную сходку ішоў студэнт юрыдычнага факультэта Уладзімір Ульянаў.**

**У рэканструкцыі універсітэта прымае ўдзел зводны атрад студэнтаў-будаўнікоў усіх вну Казані. У ім 135 чалавек. Работа вялікая. Трэба аднавіць выгляд унутранага інтэр'ера універсітэта, зрабіць такім, якім яго бачыў у 1887 годзе Уладзімір Ульянаў. За 82 гады, якія прайшлі з той пары, універсітэт, вядома, не застаўся ў першапачатковым выглядзе. Цяпер, перш за ўсё, трэба зняць з будынка наслаенні мінулых год. Іменна гэтым і займаюцца нашы камсамольцы. А пасля пад кіраўніцтвам вопытных архітэктараў і будаўнікоў пачнуцца рэстаўрацыйныя работы.**

**«ЛЕНІНЕЦ»**
**(Казанскі дзяржуніверсітэт імя У. І. Ульянава-Леніна).**

# *У студэнцкіх аўдыторыях*

На працягу месяца студэнты асноўных факультэтаў універсітэта працавалі на калгасных палях. У гэты час тыя юнакі і дзяўчаты, што прыехалі на вучобу ў Савецкі Саюз з іншых краін — студэнты падрыхтоўчага факультэта, — знаёміліся з выкладчыкамі, універсітэтам, пачалі вывучаць рускую мову.

**На здымку:** студэнты з В'етнама на занятках па рускай мове з выкладчыцай Адай Васільеўнай **Самаль.**

Фота **М. Нечыпарэнкі.**





# СУСТРЭЧА З ПЕСНЯЙ

Пазнаёмілася я з гэтымі юнакамі і дзяўчатамі на занятках па рускай мове. Пяцёра маладых в'етнамцаў, студэнтаў падрыхтоўчага факультэта БДУ, чыталі апавяданне А. М. Горкага. Я крыху здзівілася, слухаючы іх даволі добрае вымаўленне: як-ніяк займацца яны пачалі толькі з першага верасня гэтага года.

Нарэшце ўрок закончан. Выкладчык задае заданне, развітваецца са сваімі выхаванцамі — на сёння хопіць,—і мы застаемся адны. Сядзім ва ўтульным пакойчыку, дзе яны пастаянна займаюцца, гутарым. Разумеем адзін аднаго вельмі добра. Нгуен Нгы Куй, Нгуен Тхі Кой, Ву Тхі Х'еп, Нгуен Зуй Хыу, Хоанг Тхі Ван літаральна засыпаюць мяне пытаннямі. Іх цікавіць усё: дзе жывуць, чым займаюцца мае бацькі, сябры. Асабліва многа пытанняў пра факультэт, на якім я вучуся, і пра студэнтаў — будучых журналістаў. Ахвотна расказваю аб усім, што іх цікавіць. А пасля сама прапаную пытанні:

— Як праходзяць заняткі ў вашай групе? Кім вы будзеце пасля вучобы?

ВАН: Усяго на нашым падрыхтоўчым факультэце займаецца 140 чалавек. Мы, пяцёра, прыехалі да вас у мінулым годзе. Не адразу прывыклі да клімату Беларусі і з гэтай прычыны на працягу года не маглі займацца. Аднак час не прайшоў марна, нашы веды па рускай мове значна папоўніліся. І вось цяпер мы ўжо размаўляем па-руску. Першыя некалькі тыдняў вучым толькі рускую мову. Хутка нам будуць выкладаць матэматыку, хімію, фізіку, чарчэнне. Умовы для вучобы ёсць. Наш падрыхтоўчы факультэт мае вельмі добрыя ўласныя фізічны, хімічны кабінеты, спецыяльны пакой для чарчэння. Цудоўна абсталяван новымі прыборамі фанетычны кабінет.

Праз год, калі мы закончым падрыхтоўчы факультэт, нас залічаць студэнтамі асноўных факультэтаў БДУ і іншых вышэйшых навучальных устаноў краіны. Я, напрыклад, хачу стаць эканамістам, Хыу — хімікам... Наогул, у кожнага з нас ёсць свая запаветная мэта, для ажыццяўлення якой патрэбна ўпартая праца ў бібліятэках, лабараторыях.

— Хочацца, каб хто-небудзь з вас расказаў крыху пра сябе. Кой, калі ласка!

КОЙ: Я прыехала ў Савецкі Саюз у мінулым годзе з правінцыі Ха Тай, што недалёка ад Ханоя. Закончыла дома сярэднюю школу. Мая мама, сястра і брат былі вельмі рады, калі даведаліся, што я паеду вучыцца ў вашу цудоўную краіну. Я, вядома, радавалася больш за ўсіх. Шкада толькі, што бацьку не давялося пачуць гэту шчаслівую навіну. Ён загінуў на фронце, змагаючыся з захопнікамі за свабоду нашай Радзімы. Але мой старэйшы брат адпомсціць за смерць бацькі — зараз ён таксама салдат.

Спадзяюся, што, пакуль я закончу вучобу, наш народ пераможа ў справядлівай барацьбе, а за час вучобы я пастараюся як мага больш пазнаць, каб вярнуцца на Радзіму добрым спецыялістам.

— Ці спадабаўся вам наш Мінск? Калі спадабаўся, то чым? Дзе вы яшчэ паспелі пабываць?

Х'ЕП: Мы ўжо пабывалі ў Іркуцку, Новасібірску, Маскве. Не так даўно наведалі Брэсцкую крэпасць-герой і Хатынь. Летам адпачывалі ў спартыўна-аздараўленчым лагеры на Нарачы.

На ўсё жыццё запомнім вашу зіму. У вас мы ўпершыню ўбачылі снег. Вось дзе цікава было! Прывыклі і да вашых страў. Больш за ўсё любім беларускую бульбу.

— Х'еп, як вам падабаюцца савецкія людзі?

Х'ЕП: Калі гаварыць шчыра, дык ваш горад перш за ўсё падабаецца сваімі жыхарамі. Як толькі мы прыехалі сюды, адразу з прыемнасцю адчулі клопаты савецкіх людзей, якія імкнуліся растлумачыць нам усё незразумелае, дапамагалі прызвычаіцца да новых абставін. Вось, напрыклад, я і Ван жывем у адным інтэрнацкім пакоі са студэнткамі хімічнага факультэта Людай Сняжко і Надзяй Графкінай. Якія гэта цудоўныя дзяўчаты! Колькі цікавага яны расказалі нам аб Савецкім Саюзе, аб Беларусі! Пазнаёмілі нас з народнымі традыцыямі. Нашы новыя сяброўкі дапамагаюць нам вывучаць рускую мову.

— Ці цяжка даецца вам руская мова?

ХЫУ: Канешне, яна вельмі адрозніваецца ад в'етнамскай, і ўсё ж, вывучаючы яе, мы адчуваем своеасаблівую прыгажосць, меладычнасць рускага слова.

Нам вельмі хочацца як мага хутчэй вывучыць рускую мову, каб лягчэй было глядзець савецкія фільмы, чытаць творы вашых вялікіх пісьменнікаў у арыгінале — Л. Талстога, А. Чэхава. Некаторыя з іх мы чыталі на Радзіме ў перакладзе на в'етнамскую мову. Мне асабліва спадабаўся раман А. М. Горкага «Маці». Я думаю, што мову вялікага Леніна хацеў бы вывучыць кожны ў нашай краіне.

— А што вы ведаеце пра Уладзіміра Ільіча?

КУЙ: Пра Леніна ведае ўвесь в'етнамскі народ. У нас на Радзіме гавораць: «Ленін — гэта самая светлая, нягаснучая зорка на небасхіле, якая паказвае народам свету шлях да свабоды, міру, роўнасці, братэрства і шчасця».

ВАН: Ленін стварыў першую ў свеце сацыялістычную дзяржаву, а В'етнам заўсёды будзе ісці па шляху Леніна, па шляху сацыялізма.

ХЫУ: Ведаем, што Ленін гаварыў: вучыцца, вучыцца, вучыцца — гэта галоўная задача моладзі. Мы памятаем аб гэтым, і зараз наша самая вялікая мэта — як мага больш пазнаць, як мага больш навучыцца...

Доўга гутарылі мы. Мае новыя знаёмыя расказвалі аб сваёй Радзіме, аб пісьмах, якія яны атрымліваюць з дому, аб сваіх новых сябрах-студэнтах, аб тым, як цікава праходзяць вечары ў Доме дружбы, як падабаецца ім выкладчык, што паспелі прачытаць па-руску, якія нашы песні ўжо ведаюць... І тут, не згаворваючыся, яны заспявалі: «Я люблю тебя, жизнь, что само по себе и не ново...». Яны так дружна і старанна выводзілі мелодыю, што я не вытрымала і заспявала разам з імі...

**А. АЛЕКСАНДРОВІЧ.**

# СПОРТ

## ПЕРАМОЖЦЫ ЛЕТНІХ СТАРТАЎ

**На прайшоўшай летняй спартакіядзе вну рэспублікі каманда БДУ ва ўпартай барацьбе з інстытутам фізічнай культуры заняла ў агульнакамандным заліку І месца. Вельмі каштоўны ўклад у гэтую перамогу ўнесла выкладчык кафедры фізвыхавання БДУ міжнародны майстар спорту Аляксандра Жалабковіч. Кінуўшы дыск на 53 м 76 см, яна заняла першае месца, устанавіўшы рэкорд Белсавета «Буравеснік». Яна ж дабілася поспеху і ў штурханні ядра — ІІ месца, вынік — 13 м 48 см, уступіўшы першынство супрацоўніцы універсітэта М. Г. Дубаграевай (13 м 55 см).**

**У трайным прыжку І месца і залаты медаль заваяваў Ігар Тарасюк. Сярод прыгуноў з шастом пераможцам стаў прадстаўнік юрфака Юрый Глыбоўскі.**

**Трэцяе месца і бронзавы медаль заваявала наша жаночая каманда ў эстафетным бегу 4×100 (Бяляева, Брудская, Цагойка, Бубнова).**

* * *

**26—27 верасня на стадыёне «Дынама» праходзіў паўфінал кубка СССР па лёгкай атлетыцы — кубак «Известий». Гонар сталіцы рэспублікі ў гэтых вялікіх спаборніцтвах абаранялі і прадстаўнікі універсітэта. Супрацоўнік БДУ Яўген Бароўскі у трайным прыжку заняў І месца з вынікам 15 м 61 см.**

**Студэнтка трэцяга курса хімфака В. Бяляева зрабіла вельмі многае для перамогі каманды Мінска ў эстафетным бегу 4×400 і паспяхова выступіла на дыстанцыі 200 м, заняўшы ІІ месца.**

**В. ЯКАНЕН,**

## ВАС запрашаюць

*ФАКУЛЬТЭТ грамадскіх прафесій аб'яўляе набор студэнтаў на 1969-1970 навучальны год на наступныя аддзяленні:*

*ХАРЭАГРАФІЧНАЕ*
*ЛЕКТАРАЎ*
*ПІЯНЕРСКІХ ВАЖАТЫХ*
*СУДДЗЯЎ І ГРАМАДСКІХ ІНСТРУКТАРАЎ ПА СПОРЦЕ*
*РЭЖЫСЁРСКАЕ*
*ХОРМАЙСТАРСКАЕ*

*Тэрмін навучання на рэжысёрскім і харэаграфічным аддзяленнях — тры гады, хормайстарскім — два гады, на астатніх—адзін год.*

*Харэаграфічнае аддзяленне рыхтуе кіраўнікоў самадзейных танцавальных калектываў, хормайстарскае— кіраўнікоў самадзейных харавых калектываў, рэжысёрскае — рэжысёраў самадзейных тэатральных калектываў.*

*Той, хто заканчвае факультэт, атрымлівае пасведчанне і права на работу па спецыяльнасці, набытай на адпаведным аддзяленні.*

*Пачатак заняткаў 15 кастрычніка. Заявы аб прыёме падаваць у камітэт камсамола.*

*САВЕТ ФАКУЛЬТЭТА ГРАМАДСКІХ ПРАФЕСІЙ.*

# КАРЫСНА ВЕДАЦЬ

## *ПЕРШЫЯ БІБЛІЯФІЛЫ НА РУСІ*

**Легендарная бібліятэка Івана Грознага, зацікаўленасць да якой асабліва ўзрасла за апошнія гады,—далёка не адзіная скарбніца, не знойдзеная сучаснай навукай. Кнігу на Русі любілі і збіралі з глыбокай старажытнасці. Напэўна, адным з першых рускіх бібліяфілаў быў рускі князь Яраслаў Мудры, аб якім летапісец з павагай пісаў: «Сам кнігі чытаў». Згодна са старажытнымі крыніцамі, Яраслаў сабраў вялізную бібліятэку і захоўваў яе ў пабудаваным ім у Кіеве саборы святой Соф'і. Ніякіх слядоў бібліятэкі да гэтай пары не знойдзена. Але, з другога боку, няма ніводнага ўпамінання аб яе гібелі.**

## *НАРОДЖАНАЯ Ў XVI ВЕКУ*

**Ці даўно з'явіліся коскі ў кнігах? Параўнаўча нядаўна: на рубяжы XV і XVI стагоддзяў. Іх увёў вядомы венецыянскі выдаўца Альд Мануцый. Да гэтага ў кнігах ставілі толькі кропку і двухкроп'е. Мануцый увёў і аглаўленні да выдаваемых ім кніг. Заглаўны ліст кнігі ён звычайна вывешваў ля ўваходу ў кніжную лаўку. Гэта, напэўна, была самая першая ў свеце рэклама ўвогуле і кніг ў прыватнасці.**

## *МАРК ТВЕН — ВЫНАХОДНІК*

**19 снежня 1873 года нехта Самюэл Клеменс атрымаў патэнт за ўдасканаленне плацянога шкафа. Другое вынаходніцтва Клеменса так і называлася — «Блакнот Марка Твена». Гэта і быў прататып цяперашняга блакнота з адрыўнымі лісткамі.**

**Спачатку вынаходніцтва Марка Твена карысталася асаблівым попытам у акцёраў, якія развучвалі ролі. Пасля зручныя блакноты сталі шырока прымяняцца ў канторах і ўстановах. «Гэта была яго адзіная кніга,— жартаўліва адзначаў пасля адзін з біёграфаў пісьменніка,— у якой не было ні аднаго слова, і таму яна не выклікала зайздрасці крытыкаў».**

## ВАС запрашаюць

*ТАВАРЫСТВА ДТСААФ запрашае членаў таварыства прыняць актыўны ўдзел у рабоце гурткоў па тэхнічных і ваенна-прыкладных відах спорту:*

*СТРАЛКОВАМУ*
*ПАРАШУТНАМУ*
*РАДЫЁСПОРТУ.*

*Запісацца можна ў камітэтах ДТСААФ факультэтаў.*

*Аб'яўляецца прыём на курсы (платныя) па падрыхтоўцы*

*ШАФЁРАЎ-АМАТАРАЎ*
*МАТАЦЫКЛІСТАЎ.*

*Арганізацыйны сход адбудзецца 9 кастрычніка ў 17.00 на ваеннай кафедры.*

*КАМІТЭТ ДТСААФ БДУ.*

Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.

АТ 11941 Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106 Т-22-07-19. Друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. Зак. 1567. Тыраж 2000 экз.